**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

# Свята

“Ехала Каляда
ў чырвоным вазочку”

Распрацавала і правяла Трошка Аксана Міхайлаўна, педагог-арганізатар

**Мэты і задачы свята:** Пашырыць веды дзяцей пра беларускія святы. Выхоўваць любоў да роднай мовы, Радзімы. Аб’ядноўваць іх праз сумесную актыўную дзейнасць. Развіваць творчасць дзяцей, іх талент. Вучыць выконваць беларускія народныя песні, танцы.



■ Шаноўныя сябры! Гаспадары нашай гасцёўні! Дзядзька Цярэшка! Цётка Шчодра запрашаюць да сябе на навагодняе свята вас, «калядоўшчыкаў», «батлеечнікаў», «цыган», а таксама «козак», «конікаў», «мядзведзікаў».

Вядучыя

■ Прыйшлі калядкі! - бліны ды аладкі.

■ Зімовы дзянёк, што камароў насок.

■ Зіма на лето робіць, а лета на зіму.

■ Калі не будзе зіма бела, то не будзе ўлетку зелена.

■ Зіма - свякруха, а лета - маточка.



■ Студзень хаты студзіць - рана гаспадарароў будзіць.

Каляды, Калядкі
Везлі бліны, аладкі
У маляваным вазочку,
На вараненькім канёчку.

■ Прыехала Каляда ўвечары
Ды прывезла пірагі ў рэшаце,
Паставіла пірагі на стаўне
А сама села на куце.
А дзеці хап пірог,
Да пайшла Каляда за парог.



■ Бегла Каляда пешком - пешком,
Несла піражкі мешком - мешком.
Прыехала Каляда звечара, звечара
Ды прывезла дудак рэшата, рэшата.
Ды паставіла на стаўне, на стаўне,
А сама села на куце, на куце.
Авы, дудачкі, іграйце, іграйце,
А вы, дзевачкі, гуляйце, гуляйце,
А вы, хлопчыкі, свісціце,
А вы, дзевачкі, пляшыце, пляшыце!

■ А калядныя бліны ладныя,
А пшанічныя вельмі пышныя.

■ Каляды - даўняя народнае навагодняе свята нашых дзядуляў і бабуль, на якім вадзілі «казу», каб на полі радзіла, вадзілі «медзведзя», каб былі ў сям'і ўсе здаровымі і багатымі.

Спявалі Калядкі і шчадроўкі, у якіх зычылі дабрабыту і шчасця.

■ Лічылася, як правядзеш калядны навагодні вечар, такі будзе і ўвесь год.

■ Таму рыхтавалі пад Новы год багатую вячэру, якая называлася «Шчодрая куцця».

**Свята пачынаюць гаспадары**



Цярэшка даганяе Шчодру, смешачы дзяцей.

● О мая ж ты, бабулька,
Я твой дзядулька
Хоць жа павалюся,
За табой паганюся.
Хоць я ножку зламлю,
А цябе злаўлю.

Шчодра хаваецца. Затым яна пытае.

■ Ці бачыш ты мяне?

Не бачу!

Каб жа ты не бачыў за стагамі,
за копамі, за вазамі, за снапамі свету!

■ - А ці не бачыш ты мяне, Шчодра?

Не бачу!

Каб жа ты не бачыла за гуркамі, за гарбузамі, за капустаю, за буракамі свету!

Шчодра:

■ Каб твае словы ды праўдаю сталі!

Цярэшка:

■ Каб было шчодра на стале і ў агародзе, мая бабка пад абрус раней клала сена або жытнюю салому.

Шчодра таксама гэта робіць. Нечакана чуецца стук у акне.

Цярэшка:

- Шчодра, гэта э мусіць калядоўшчыкі просяцца?

Калядоўшчыкі са « звездою» (Калядоўшчыкі ўсе разам)

Добры вечар таму

Хто ў гэтым даму»

Святы вечар!

Добры вечар вам! Ці рады вы нам?

Мы то рады, ды хто вы такія?

Мы люд не просты, а з далёкага краю, людцы ўсе сталыя, з-пад самага раю.

Адкуль ідзеце?

Ідзем мы ад пана Года, што носіць бараду шырокую як лапату, сіву і калмату. Мы к лету ідзём, казу вядзём і радасць нясём. Ці шырокі сцены, каб нам патанцаваць. Ці добра гаспадыня, каб нас пачаставаць?

Гаспадыня добрая і нават шчодрая. Дык за што ж вас частаваць? Спачатку трэба паспяваць.

А - ну, каза, паскачы.





Выконваецца песня « ГО-го, каза»

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэра.
Дзе рожкі дзела?
На соль праела.
Лезь, каза, на печ.
Пакажы чапец.
Лезь, каза, на кут
Пакажы хамут.
Лезь, каза, на пол.
Пакажы хахол.
На печы авёс
Вялікі парос.
На палу жыта
Нагамі збіта.
А ў гэтым жыце перапёлачка

Вывела дзеці,
Міла глядзеці.
Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
А дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.

Цыган, які прыводзіць «мядзведзя», прапаноўвае гульню. Усе разам спяваюць песню:

У мядзведзя на бару
Грыбы ягады бяру.
Мядзведзь рычыць,
На нас глядзіць.

Пасля апошняга слова ўсе разбягаюцца, а «мядзведзь» ловіць. Той, хто будзе злоўлены, павінен адгадаць загадку, тады медзведзь адпусціць. Калі загадка цяжкая для злоўленага, то на дапамогу прыходзяць сябры.

Прапануем загадкі.

- Ходзіць тата каля плота, пытае ў жмуркі: «Ці дома ляпка?» (воўк, кот, сабака)
- Прыйшла кракота пад новы варота, пытае ў лапаты: «Ці дома пандра?» (воўк, сабака, свіння).
- На гару бягом, а з гары кувырком (заяц).
- Невялікі, рыжаваты, а хвост доўгі і калматы, на дрэве жыве і шышкі грызе ( Вавёрка).
- Хоць малы ён, часам з кулак, але ў рукі не возьмеш ніяк (Вожык).
- Не рыба, а плавае, не конь, а ходзіць, не пілка, а рэжа ( Бабёр).
- Які звер астаўляе птушыныя следы? (Выдра).
- Паўзун паўзе і іголкі вязе (Вожык).

Ну і якое ж Навагодняе свята без Дзеда Мароза і Снягурочкі. Яны з'яўляюцца нечакана. Ім дзеці расказваюць вершы, спяваюць песні. Дзед Мароз і Снягурка віншуюць усіх з Новым годам.

Калядоўшчык і гаспадыня спяваюць:

А калядныя бліны ладныя,
Ой, рана, рана, бліны ладныя.
А Мікольскія бліны жорсткія,
Ой, рана, рана, бліны жорсткія.



Мы ж вас, калядачкі, шанаваць будзем,
Ой, рана, рана, святкаваць будзем,
Ой, рана, рана, святкаваць будзем.
Шторанейка бліны печ будзем,
Ой, рана, рана, бліны печ будзем.
Калядоўшчык.

- Дзяўчаты, хлопцы, давайце заспяваем нашу любімую песню «Ой аралі хлопцы ніву, паламалі ярмо» (Спяваюць)

Калядоўшчык.
Без скрыпачкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды,
А гармонік як пачуюць
Ножкі самі затанцуюць.
Дзеці.
Танцавалі мы гапак,
Танцавалі рускую,
Паглядзіце зараз як
Скачам беларускую.




Тут-тук, чаравік,
Не ляніся,
Туды сюды чаравік,
Павярніся.

Дзяўчынка Надзейка,
У круг ідзі хутчэй-ка,
Патанцуй-ка, на памосце,
Будуць рады нашы госці.

На Палессі стук і звон,
Гэта грае наш Левон,
З дудачкай да нас ідзе,
Мікіту да нас вядзе.

Гаспадыня. Давайце адпачнем крыху ды пагуляем у гульню: усім вам трэба гаварыць словы «І я разам»

- Пайду ў лес.
- І я разам - зрэжу дрэва
- І я разам - высеку карыта
- І я разам - будуць з яго свінні есці
- І я разам.



Гаспадыня. А цяпер давайце ўспомнім народныя прыкметы.

1. Студзень халодны - будзе год плодны.
2. Калі ў студзені дажджы - дабра не жджы.
3. Студзень мяце - ліпень залье.
4. Вераб'і ўзімку дружна раскрычаліся - на адлігу.

Гаспадыня шчодра ўсіх частуе пірагамі з рэшата. Усе пачастункі можа прымаць механоша.